2. Кривуля, Н. Г. Анимация как феномен культуры [Электронный ресурс] / Н. Г. Кривуля // Анимация и мультимедиа между традициями и инновациями : Анимация как феномен культуры : матер. V Междунар. науч.-практ. конф. (г. Москва, 7-8 октября 2009 г.) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.m.fictionbook.ru/author/kollektiv_avtorov/animaciya_i_multimedia_mejdu_tradiciyami/read_online.html?page=1. – Дата доступа: 30.03. 2019.
3. Михаил Тумеля о героях белорусской анимации (06.04.2011) [Видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: http://www.youtube.com/watch?v=etkNIB7WTfg. – Дата доступа : 31.03.2019.
4. Народная песня [Электронный ресурс] // Словари и энциклопедии на Академике. – Режим доступа: http://www.dic.academic.ru/dic.nsf/enc3p/208478. – Дата доступа : 02.03.2019.
5. Панкратава, Н. Свавольны перамантаж не паводле аўтара [Электронный ресурс] / Н. Панкратава // Культура. – 2016. – № 6 (1236), 6–12 лют. – Режим доступа : http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=12551. – Дата доступа : 30.03.2019.
6. Shahriari, Andrew C. Euro-pop and folk fusions / Andrew C. Shahriari // Popular world music. – London, New York : Routledge, 2015. – Ch. 6. – P. 103–127.

***Ала Багунова, Наталля Мазурына***

## МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ФАКУЛЬТАТЫВА «БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ» ВА ЎСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ «МАГІЛЁЎСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ШКОЛА МАСТАЦТВАЎ №1»

*У артыкуле разглядаецца сістэма метадычнага забеспячэння выкладання факультатыва «Беларуская народная творчасць» на прыкладзе яе ўкаранення ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1». Аналізуецца сацыяльнае, эмацыянальнае і духоўнае выхаванне вучняў.*

***Ala Bagunova Natalia Mazuryna***

## METHODICAL MAINTENANCE OF ELECTIVE COURSE «BELARUSIAN FOLK ART» IN EDUCATIONAL INSTITUTIONS «MOGILEV CHILDREN'S ART SCHOOL №1»

*The article deals with the system of methodological support of teaching elective «Belarusian folk art» on the example of its implementation in the educational institution «Mogilev Children's Art School №1». Analyzed socional, emotional and spiritual education of students»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходнасць звароту да вытокаў народнага мастацтва, традыцый, звычаяў народа не выпадковая. Парушыліся традыцыі, парваліся ніткі, якія злучалі старэйшае і малодшае пакаленні. Таму вельмі важна адрадзіць пераемнасць пакаленняў, даць дзецям маральныя асновы, патрыятычныя настроі, якія жывыя ў людзях старэйшага пакалення.

Перш чым казаць аб змесце і асаблівасцях метадычнага забеспячэння выкладання любой вучэбнай дысцыпліны ці факультатыўных заняткаў, неабходна вызначыць межы тэарэтычнага паняцця. Тэрмін *«метадычнае забеспячэнне»* выкарыстоўваецца ў педагогіцы ў двух сэнсах: як працэс і як вынік. ***«Метадычнае забеспячэнне як працэс*** – гэта планаванне, распрацоўка і стварэнне аптымальнай сістэмы вучэбна-метадычнай дакументацыі і сродкаў навучання, неабходных для эфектыўнай арганізацыі адукацыйнага працэсу ў межах часу і зместу, якія вызначаюцца прафесійнай адукацыйнай праграмай» [1, с. 411]. ***«Метадычнае забеспячэнне як вынік*** – гэта сукупнасць усіх вучэбна-метадычных дакументаў (планаў, праграм, методык, навучальных дапаможнікаў і г. д.), якія ўяўляюць сабой сістэмнае апісанне адукацыйнага працэсу, які пасля будзе рэалізаваны на практыцы. У гэтым сэнсе метадычнае забеспячэнне з'яўляецца дыдактычным сродкам кіравання падрыхтоўкай спецыялістаў, комплекснай інфармацыйнай мадэллю педагагічнай сістэмы, задае структуру, і якая адлюстроўвае пэўным чынам яе элементы,» – сфармулiравана ў працы В. М. Волік і Е.А.Сулейманавай [1, с. 410].

Пытанні метадычнага забеспячэння з'яўляюцца дастаткова распрацаванымі як у беларускай, так і ў расійскай педагогіцы. Аднак, іх распрацоўка ў дачыненні да факультатыва «Беларуская народная творчасць» у дастатковай ступені не праводзілася, што і складае навізну даследавання.

Метадычнае забеспячэнне факультатыва ў працы з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту ўключае вучэбную праграму, метадычныя рэкамендацыі, тэматычны план пазааўдыторных заняткаў, методыкі працы, метадычныя дапаможнікі і матэрыялы. ***«Факультатыўны прадмет*** – (фр. facultatif – ад лац. facultas – «магчымасць») – неабавязковы навучальны курс або прадмет, які вывучаецца ў школе па выбары вучня» [4, с. 15]. Гэта адмысловая арганізацыйная форма вучэбна-выхаваўчай працы, адрозная і ад урока, і ад пазакласнай працы. Як і ўрокі, факультатыўныя заняткі праводзяцца згодна з зацверджанымі праграмамі і планамі, вядзецца іх улік, заняткі ідуць па раскладзе. На іх ужываюць агульныя з урокам метады навучання і формы арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

Падабенства з прадметнымі гурткамі складаецца ў тым, што факультатыў, як і гурток, аб'ядноўвае групу вучняў на аснове агульных інтарэсаў, добраахвотнасці выбару гэтай формы навучання. Працуючы з адносна невялікім лікам зацікаўленых вучняў, выкладчык у большай меры, чым на ўроку, можа ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход, падбіраць заданні ў залежнасці ад схільнасцяў і асаблівасцяў вучняў.

Факультатыўныя заняткі прадугледжваюць высокі ўзровень творчых здольнасцяў навучэнцаў. Тут шырэй, чым на ўроках, можа быць ужыты даследчы метад, які сучасная дыдактыка разглядае як выхаваўчы працэс ў сістэме метадаў. На сённяшні дзень ў сістэме агульнай адукацыі нашай краіны існуюць шырокія магчымасці для правядзення факультатыўных заняткаў па розных напрамках вучэбнай дзейнасці. Кожная ўстанова адукацыі вызначае свой пералік факультатыўных заняткаў, які можа змяняцца ў наступным навучальным годзе. У сістэме дадатковай адукацыі існуюць свае падыходы да арганізацыі працэсу навучання і выхавання, развіцця творчых здольнасцей дзяцей. Па сутнасці, амаль усе напрамкі дзейнасці ўстаноў дадатковай адукацыі могуць скласці змест факультатыўных заняткаў у сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Гэта залежыць ад кваліфікацыі педагогаў, жаданняў дзяцей і іх бацькоў, іншых прычын.

Навучанне ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1» арганізавана ў інтэграцыі з працай установы адукацыі «Сярэдняя школа №25 г.Магілёў». У першай з іх вучэбны працэс здзяйсняецца па напрамках дзейнасці (блоках): 1) музычны; 2) тэатральны; 3) харэаграфічны; 4) выяўленчы.

У кожным з напрамкаў дзейнасці існуе шэраг абавязковых для навучання, а таксама факультатыўных дысцыплін. У музычным напрамку дзейнасці школы мастацтваў факультатыўнымі з'яўляюцца заняткі «Беларуская народная творчасць», «Сальфеджыа». У тэатральным напрамку працуюць факультатывы «Музычная грамата», «Беларуская народная творчасць», «Вакальны ансамбль». У

выяўленчым – «Кампазіцыя», «Скульптура». Вельмі важна менавіта ў малодшым школьным узросце закласці любоў да фальклору, разуменне мовы і вобразнасці народнай творчасці. Сам зварот да фальклору мае вялікае выхаваўчае і адукацыйнае значэнне, фундаментальна ўздзейнічае на фарміраванне чалавека. У дзяцей малодшага школьнага ўзросту з'яўляецца разуменне народных традыцый і культуры, выхоўваецца пачуццё патрыятызму. Фальклор здольны фарміраваць у дзецях добры мастацкі густ, цікавасць да традыцыйнай народнай культуры.

Пры гэтым трэба ўлічваць, што педагагічны фактар, з дапамогай якога ажыццяўляецца працэс развіцця цікавасці да вуснай народнай творчасці ў падрастаючага пакалення, адыгрывае вялікую ролю. Неабходны актыўныя педагагічныя метады.

Улічваючы тое, што малодшы школьны ўзрост з'яўляецца асабліва перспектыўным у развіцці эстэтычнай успрымальнасці, неабходная дастатковая нагрузка на памяць дзяцей. Яна стварае запас уражанняў і ведаў, патрэбных для далейшага фармавання цікавасці да вуснай народнай творчасці. Музычны слых дзяцей будзе развівацца тым больш паспяхова, чым глыбей дзеці будуць вывучаць (слухаць, спяваць, аналізаваць) сваю народную музыку, творчасць іншых народаў.

Не сакрэт, што адукацыйныя і выхаваўчы працэсы могуць стаць больш эфектыўнымі, калі выкарыстоўваць міждысцыплінарныя сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, напрыклад, сальфеджыа, беларускай мовай і літаратурай, музыкай, рытмікай і г. д. Вывучэнне беларускай народнай творчасці, этнічнай культуры аб'ядноўвае, дазваляе мець зносіны з аднадумцамі, умацоўваючы сяброўскія і дзелавыя кантакты з аднагодкамі. Сумесныя экскурсіі, творчая, праектная, экспедыцыйна-пошукавая дзейнасць, наведванне музеяў і рэпетыцый фальклорных калектываў даюць магчымасць дзецям ўсведамляць сябе ўдзельнікам працэсу захавання традыцый беларускага народа, узбагачэння культуры свайго рэгіёну.

У вучэбных планах дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў няма такой вучэбнай дысцыпліны, як «Народная творчасць», хаця кароткае знаёмства з жанрамі народных песень прысутнічае ў курсе чацвёртага года навучання па «Музычнай літаратуры» і першага года навучання па «Музычнай грамаце».І толькі ў галіне дадатковай адукацыі знаходзім сістэмныя праграмы, прысвечаныя вывучэнню беларускай народнай творчасці. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэссу з'яўляецца занятак працягласцю 45 хвілін.

У працэсе працы над магістарскай дысертацыяй была пастаўлена задача распрацаваць праграму факультатыва «Беларуская народная творчасць» для навучэнцаў малодшых класаў, што і было зроблена. Праграма атрымлівае ўкараненне ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1». Заняткі праходзяць з перыядычнасцю адна гадзіна (45 хвілін) на тыдзень, 35 гадзін на год. Праграма арыентуе на засваенне нацыянальных духоўных і маральных каштоўнасцей, творчы характар успрымання вучнямі вучэбнага матырыялу.

**Мэта** педагагічнага эксперымента – апрабіраваць метадычнае забеспячэння факультатыва «Беларуская народная творчасць» ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1».

**Задачы** эксперыментальнай работы: 1) выявіць элементы метадычнага забеспячэння факультатыва «Беларуская народная творчасць»; 2) удакладніць змест і месца метадычнага забеспячэння факультатыва «Беларуская народная творчасць»; 3) укараніць правядзенне факультатыва «Беларуская народная творчасць» у вучэбны працэс; 4) далучыць да традыцый беларускай народнай творчасці дзяцей малодшага школьнага узросту.

Асаблівасці пабудовы праграмы звязаны з асаблівасцямі навучання ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1» у інтэграцыі з установай адукацыі «Сярэдняя школа № 25 г. Магілёў». Таксама яна звязана з працэсам паступовага засваення навучэнцамі спецыфікі народна-песеннай мовы, яе інтанацыйна-ладавых і метрарытмічных асаблівасцяў.

Характар адукацыйнага працэсу абумоўлены фальклорным рэпертуарам, формамі і тэхнікамі яго канцэртна-сцэнічнага ўвасаблення. Рэпертуар выконвае функцыі духоўна-эстэтычнага выхавання, улічваючы неабходнасць захавання тэматычнай, стылістычнай і жанравай разнастайнасці. Пры гэтым выкарыстоўваюцца прынцыпы ад простага да складанага, паступовасці і паслядоўнасці ў авалодванні тэхнічнымі навыкамі выканання і развіцця творчых здольнасцей дзяцей.

Змест заняткаў з навучэнцамі грунтуецца на метадалагічных пазіцыях, якія звязаны з рэалізацыяй асобасна арыентаванага і культуралагічнага падыходаў. У аснову адбору навучальнага матэрыялу пакладзены прынцыпы нацыянальна-культурнай адметнасці, адпаведнасць зместу навучання наяўнаму часу, які адводзіцца згодна з вучэбна-тэматычным планам [3].

Асноўнымі накірункамі працы з вучнямі з'яўляюцца фарміраванне асноўных вакальна-харавых навыкаў, навыкаў сольных спеваў, мастацка-эстэтычнага густу, стымуляванне росту іх духоўнасці сродкамі дзіцячага песеннага фальклору, каляндарна-абрадавай песеннасці беларусаў. Так, на занятку па тэме «Гуканне вясны» вучні знаёмяцца і спрабуюць самі перадыць стылістыку антыфоных спеваў, характэрных для Падняпроўя. Вучні робяць гэта на матэрыяле нескладанай песні «Агу, вясна». Пры праслухоўванні песні «Вол бушуе» са свайго і іншага рэгёна вучні адзначаюць асаблівасці выканання розных варыянтаў. Можна адзначыць, што пры вывучэнні тэмы «Беларускі народны касцюм», захапляюцца гэтым не толькі вучні, але і іх бацькі. Сумесна з бацькамі арганізаваны паход у этнаграфічны музей г. Магілёва, дзе мы маем магчымасць пабачыць у жывую народныя касцюмы. Бацькі актыўна прынімаюць удзел у арганізаваных мерапрыемствах, святах, дапамагаюць сваім дзецям дома пры вывучэнні песень, вершаў, падрыхтоўцы вырабаў ДПМ.

У праграме факультатыва прадугледжаны комплексны падыход да арганізацыі пазнавальнай дзейнасці: вывучэнне тэарэтычных асноў народнай культуры, выкарыстанне розных відаў дзейнасці (слуханне музыкі, выкананне твораў, самастойныя і калектыўныя міні-даследаванні, ілюстраванне, інсцэніраванне, рэканструкцыя абрадаў, а таксама гульні, вандроўкі, экскурсіі, наведванне тэатраў, выстаў, этнаграфічнага музея, канцэртаў фальклорна-этнаграфічных калектываў, праслухоўванне магнітафонных запісаў, прагляд навукова-папулярных кінафільмаў, падрыхтоўка і правядзенне вечарын гумару, народнай песні, пошукава-краязнаўчая праца і інш.). Прадугледжана вакальна-харавая работа, заняткі па народным касцюме, рэпетыцыйна-пастановачная дзейнасць.

Такім чынам, укараненне праграмы факультатыва «Беларуская народная творчасць» ва ўстанове адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1» дае магчымасць выявіць элементы метадычнага забеспячэння факультатыва, удакладніць яго змест і месца ў сістэме навучання, далучыць да традыцый беларускай народнай творчасці дзяцей малодшага школьнага узросту.

**Спіс літаратуры:**

1. Волик, О. Н. Состав и структура методического обеспечения информационно-средового подхода к модернизации профессионального образования / О. Н. Волик, Е. А. Сулеманова // Образовательные технологии и общество. – 2012. – № 4. – С. 409–419.
2. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі, Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 439 с. – (Беларускі фальклор : Жанры, віды, паэтыка ; кн. 6 ).
3. Спадчына маёй краіны : матэрыял для азнаямлення дзяцей з гісторыяй і культурай Беларусі : у 2 ч. Ч. 2 / склад. І. К. Грышкевіч. – Мазыр : Содействие, 2005. – 124 с.
4. Факультатив // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. Т. 27 / Гл. ред. А. М. Прохоров. – 3-е из. – М. : Советская энциклопедия, 1969–1978.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ